*УДК 130.2*

# Пераемнасць гістарычнай і сацыякультурнай спадчыны як каштоўнасны арыенцір для сучаснай моладзі

# Continuity Of Historical And Socio-Cultural Heritage As A Value Reference For Modern Youth

**Н. С. Клішэвіч**
*даследчык у галіне культуралогіі,*
*Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (Мінск, Беларусь)*

**N. S. Klishevich**
*Researcher in Cultural Studies, National Institute for Higher Education (Minsk, Belarus)*

***E-mail:*** *ni-center@mail.ru*

*Духоўныя традыцыі з'яўляюцца культура-генетычным кодам, праз які фарміраванне маладога пакалення становіцца адным з галоўных фактараў забеспячэння ўстойлівага развіцця дзяржавы і грамадства. Парогавыя станы асобы разглядаюцца ў русле філасофска-культуралагічных плыняў XX ст., якія збіраліся вакол гістарычнай спадчыны Беларусі, зыходзячы з культурнага кантэксту мінулага часу. Чалавечае «Я» пераўтвараецца ў нелінейную хвалю волі і адказнасці. У адпаведнасці з новымі выклікамі сучаснасці можна казаць пра станаўленне транснацыянальнай, чалавекаразмернай карціны сацыяльнай рэальнасці. Разам з тым, нацыянальная інтэлігенцыя выступае стратэгічным прыярытэтам і ядром нацыянальнай культуры.*

***Ключавыя словы:*** *парогавыя станы асобы, экзістэнцыялізм, філасофска-культуралагічныя плыні.*

*Spiritual traditions represent a cultural and genetic code, thanks to which the formation of the young generation becomes one of the main factors of ensuring the sustainable development of the state and society.Threshold states of personality are considered through the prism of philosophical and cultural trends of the twentieth century, based on the cultural context of the historical heritage of Belarus. The human self is constructed through borderline behavior, taking into account will and responsibility. In today's changing world, we can talk about the formation of a transnational, human-sized picture of social reality. At the same time, the national intellectuals is a strategic priority and the assemblage point of national culture.*

***Keywords:*** *borderline states of personality, existentialism, philosophical and cultural trends.*

У кантэксце гуманітарнай бяспекі Беларусі моладзь з’яўляецца тым рэсурсам, носьбітам традыцыйнай культуры, інтэлектуальным патэнцыялам, які звязаны з захаваннем жыццядзейнасці грамадства. Праз культурную традыцыю парогавасці існуе патрэба ў ідэалах і маральных каштоўнасцях, у развіцці традыцыйнай духоўнай спадчыны як спосабу папярэджання знешніх і ўнутраных сацыяльных пагроз грамадства. Традыцыйная культура беларусаў заўсёды спрыяла выхаванню патрыятызма новага пакалення праз рэлігію, мараль, літаратуру.

Культурная і філасофская традыцыя XX ст. дзівіць разнастайнасцю школ і канцэпцый, але разам з тым многія з іх з’явіліся непасрэдным працягам, распрацоўкай фундаментальных ідэй, закладзеных у XIX і папярэдніх стагоддзях. Парогавыя станы асобы імпліцытна прысутнічаюць у такіх антрапалагічных кірунках, як філасофія жыцця (яе культурна-гістарычны варыянт (Дзільтэй), аксіялагічны варыянт неакантыянства (Бадэнская школа (Віндэльбанд, Рыкерт)), фенаменалогія (Э. Гусерль), экзістэнцыялізм (Ф. Дастаеўскі, Ж.-П. Сартр, А. Камю) і філасофская антра-

палогія (М. Шэлер, Х. Плеснер), бо так званы антрапалагічны паварот на першае месца выводзіць чалавека з яго перажываннямі і ўнутраным светам [5]. Інакш кажучы, тыя праблемы, якія былі важныя для свайго часу ў нямецкіх, французскіх і англасаксонскіх краінах, не абміналі і беларусаў.

Фенаменалогія разглядае парогавыя станы асобы праз вучэнне пра «чыстыя сутнасці» (феномены). Гэта філасофскае паняцце ўпершыню ўжываецца ў працы І. Ламберта «Новы органон», дзе абазначае адну з частак агульнага навукавучэння, тэорыю бачнасці (відавочнасці) (Theorie des Scheinens) [7]. Вылучаная Э. Гусэрлем і яго вучнямі «інтэнцыйнасць свядомасці», (накіраванасць на аб'ект), здольнасць свядомасці нейкім чынам ставіцца да рэчаў, уласцівасцей і сітуацый, рэпрэзентаваць ці выяўляць іх, дае нам падставу разглядаць «парогавыя станы» праз інтэнцыі, якія з'яўляюцца камунікатыўным намерам і могуць азначаць несвядомы намер, літаральна тое, што вядзе мяне знутры туды, дзе здзяйсняецца маё «Я», да досведу спазнаючай свядомасці, дзе свядомасць разумеецца не як эмпірычны прадмет вывучэння псіхалогіі, але як «трансцэндэнтальнае Я» і «чыстае сэнсаўтварэнне» (інтэнцыйнасць). Праблема інтэнцыйнасці ляжыць на скрыжаванні філасофіі свядомасці і філасофіі мовы, таму часцей за ўсё яна можа стаць своеасаблівым спосабам прачытання твораў з улікам спецыфікі філасофска-культуралагічных праблем свайго часу. Фенаменалогія робіць прадметам свайго разгляду «чыстую свядомасць». Сярод асноўных патрабаванняў фенаменалагічнага метаду – устрымлівацца ад якіх-небудзь меркаванняў, якія адносяцца да аб'ектыўнай рэальнасці і выходзяць за рамкі «чыстай свядомасці»; разглядаць сам суб'ект спазнання не як рэальную істоту, а як «чыстую свядомасць».

Беларуская нацыянальная культура развівалася, на наш погляд, парогава, перарывіста, што безумоўна паўплывала на сялянска-народную думку, матывы вуснай народнай творчасці ў навуковых даследаваннях жыцця і культуры беларусаў. Увесь час Беларусь знаходзілася на раздарожжы: выступала адмысловым пасярэднікам паміж заходнеславянскім і ўсходнеславянскім светамі. Адным з першых абгрунтаваў ідэю беларускага шляху з «парогавымі станамі» асобы І. Абдзіраловіч (Канчэўскі). У сваім трактаце «Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду» (1921) ён разглядае гісторыю Беларусі як гісторыю вагання паміж Захадам і Ўсходам [1]. Цэнтральнай выявай у яго з'яўляецца ростань, на якім стагоддзямі стаялі беларусы, не ведаючы куды падацца. Беларусь доўгі час захоўвала сваю «памежнасць» і даканцовае «недалучэнне» ні да Захаду, ні да Ўсходу. «Блуканне паміж Захадам і Ўсходам і шчырая непрыналежнасць ні да аднаго, ні да іншага з'яўляецца асноўнай адзнакай гісторыі беларускага народа. Жыццё патрабавала сінтэзу, гарманізацыі абодвух кірункаў. Дарэчы, напрыклад, менавіта з гэтым феноменам памежжа (парогавасці), на наш погляд, звязаны факт, што Беларусь стала другой краінай у свеце, якая далучылася да развіцця еўрапейскага стылю барока, цэнтрам якога з'яўлялася Італія. Менавіта праз беларускія землі барока як мастацкі кірунак атрымаў распаўсюджванне ў Маскоўскай Русі і на Украіне. Яго носьбітамі ў Беларусі былі каталіцкі ордэн езуітаў і ўніяцкі ордэн базыльянаў. Езуіты заклалі падмурак адносна высокай адукацыі, школьнага тэатра, укаранілі прафесійнае выкладанне паэтыкі, рыторыкі і філасофіі. Такім чынам, тэрытарыяльная памежнасць і звязаная з ім багатая гісторыя (ад Трох падзелаў Рэчы Паспалітай, да ўваходжання ў склад Расійскай імперыі) выявілася ў тым, што культурна-творчыя магчымасці беларусаў галоўным чынам захоўваліся ў этнаграфічнай культуры (фальклор, народныя тэатры, дойлідства, ужытковае мастацтва, абрадавая культура), усё гэта зрабіла моцны ўплыў на захаванне нацыянальных традыцый і на сучасным этапе стала адгалінаваннем культурнай антрапалогіі і этнафіласофіі. Этнафіласофія як наватарскі праект становіцца аксіалагічным апірышчам светапогляднага ўспрымання беларусаў [3]. Для таго, каб захаваць сябе, беларускай культуры патрабавалася «перайсці» на іншы ўзровень народнай, фальклорнай культуры, якая і стала на той момант адзінай беларускай культурай. Пачынаючы з XIX ст., яна набывае ўнікальную асаблівасць. Гэта культура простага сялянскага паходжання, і нацыянальная культура развіваецца далей на жывым народным гомане, на духоўным грунце народных нізоў, разам з працэсам фарма-

вання новай сялянскай інтэлігенцыі Такім чынам, у генетычным грунце беларускай культуры ляжыць найбагаты фальклор. Працяглае і шырокае яго існаванне фармавала ўстойлівыя вобразна-міфалагічныя і вобразна-фальклорныя ўяўленні ў сялянскім асяроддзі, якія пазней будуць плённа сілкаваць пісьмовую нацыянальную літаратуру, культуру і філасофію. Пошук спецыфічнасці, уласнага «твару» беларускай культуры характэрны для беларускіх дзеячаў XIX – пачатку XX ст. (Ф. Багушэвіч, Я. Купала, І. Абдзіраловіч, А. Цвікевіч і інш.). Распачыналіся спробы вызначыць сваё культурнае «Я», акрэсліць межы ўласнага існавання, адбывалася складанне нацыянальнай ідэі [8]. У фарміраванні беларускай нацыянальнай свядомасці, адраджэнні духоўнай культуры велізарную ролю адыграла літаратура, якая пазначыла каштоўнасныя арыенціры беларускай нацыі праз каштоўнасць уласнай мовы. У прадмовах да сваіх кніг Ф. Багушэвіч адным з першых стаў прапаведаваць нацыянальнае адраджэнне беларусаў, даводзячы, што яны ўяўляюць асобны, самастойны народ са сваёй мовай.

Як магчыма разуменне, калі заўсёды ты дакранаешся да «парогавасці»? Адсутнасць бесперапыннай традыцыі, уплыў розных культур і цывілізацый абцяжарвалі працэсы ідэнтыфікацыі беларусаў, не давалі выразных крытэрыяў вызначэння культурнай прыналежнасці. І мова, і рэлігія не змаглі выступіць сродкам самаідэнтыфікацыі. У розныя эпохі на Беларусі функцыянавала ў якасці літаратурных шэсць моў – стараславянская, лацінка, старабеларуская, руская, польская, новабеларуская. Аналагічных поглядаў, дарэчы, прытрымліваецца і гродзенскі культуролаг П. К. Банцэвіч, вывучаючы аксіялагічны і сімвалічны ўзровень артэфактаў беларускай літаратуры як парадыгмальных тэкстаў. Прыйшлі да высновы, што асаблівасць сістэмы каштоўнасцей у мастацкіх творах XIX ст. заключаецца ў тым, што большасць аксіялагем адносяцца да народнай (традыцыйнай) і рэлігійнай (хрысціянскай) сістэм светапоглядных каардынат [2].

Адказваючы на пытанне пра магчымасць разумення стану «парогавасці асобы» мы набліжаемся да наступнай філасофска-культурнай плыні XX ст. – герменеўтычных традыцый, – паколькі тлумачэнне свету становіцца магчымым на аснове тых самых мадэлей, што і тлумачэнне тэксту. Беларуская філасофія і культура парогавасці працягвае сваё існаванне праз творы пісьменнікаў, якія апелююць да мысляроў папярэднікаў і тым самым праз герменеўтычны круг вядуць дыялог у культурнай прасторы, апелюючы да агульнага мыслення. Філасофская герменеўтыка як традыцыя тлумачэння тэкстаў набыла ў вучэнні Х.-Г. Гадамера значэнне ўніверсальнай анталогіі разумення, падставай якой выступае мова. Калі класічная герменеўтыка акцэнтавала стаўленне «аўтар – тэкст», то сучасная герменеўтыка разглядае стаўленне «тэкст – інтэрпрэтатар». Тлумачэнне з'яўляецца тут экзістэнцыйнай акцыяй, бо той, хто разумее, з'яўляецца часткай таго, што разумее, і само па сабе разуменне (не тлумачэнне) важнейшае за правільнасць інтэрпрэтацыі.

Такім чынам «парогавасць» уласна беларускай філасофскай традыцыі паводле месца знаходжання, таму і мае месца ментальны разлом: заходнія ўплывы прыходзілі ў беларускую культуру праз каталіцкую і ўніяцкую цэрквы. Дзякуючы ім ажыццяўлялася рознабаковая і сталая сувязь з буйнымі палітычнымі і культурнымі цэнтрамі Еўропы, перадусім, Рымам. Адтуль прывозіліся мастацкія творы, якія спачатку служылі для мясцовых майстроў узорамі. Заходнееўрапейскі пачатак робіцца пераважным над усходнеславянскім, потым мяжа перасоўваецца з захаду на ўсход, што асабліва заўважна стала пасля ўваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі.

У стварэнні нацыянальнай культуры вялікую ролю выконвае нацыянальная інтэлігенцыя, эліта грамадства. Яна распрацоўвае канцэпцыю нацыянальнага з'яднання, дае асноўныя каштоўнасныя арыенціры. Менавіта інтэлігенцыя выступае носьбітам беларускай ідэі, тым пасрэднікам, дзякуючы якому адбываецца далучэнне народа да нацыянальнай культуры. Нацыянальна-культурны генацыд 30-х гг. XX ст. прыпыніў працэс развіцця беларускай нацыянальнай культуры. Пад сцягам змагання з так званымі «нацдэмаўцамі» пачаўся працэс фізічнага знішчэння беларускай інтэлігенцыі, перадусім творчай. У сталінскіх лагерах, а потым і ў гады вайны загінула тое пакаленне беларускай

інтэлігенцыі, якое пазней магло надаць сілу нацыянальнай культуры.

У часы Савецкага Саюза склаўся варыянт так званай савецкай беларускай культуры, і «парогавасць» адышла на другі план, філасофска-культуралагічная традыцыя стала развівацца ў русле сацрэалізму. Але праз творы літаратараў, мастакоў, кампазітараў мы заўважаем спробы схапіць парогавыя станы душы «простага чалавека». У выяўленчым мастацтве гэта творчасць М. Савіцкага, А. Марачкіна, А. Кашкурэвіча, драматургіі – дзейнасць А. Макаёнка, А. Дударава, літаратуры – творы В. Быкава, І. Мележа, І. Шамякіна, У. Арлова і інш. Канец XIX – пачатак XX ст. і сусветныя змены паставілі перад культурамі праблему захавання ўласнай ідэнтычнасці. Тут можна казаць пра зараджэнне экзістэнцыялізму ў беларускай філасофіі і культуры (ад фр. existentialisme, ад лат. exsistentia (існаванне)). Як напрамак экзістэнцыялізм бярэ свае вытокі ў вучэнні дацкага мысліцеля XIX ст. С. Кьеркегора праз паняцце экзістэнцыі як усведамлення ўнутранага быцця чалавека ў свеце. Экзістэнцыялізм выводзіць на першы план абсалютную ўнікальнасць чалавечага быцця праз пэўныя модусы (экзістэнцыялы) чалавечага існавання: смутку, трывогі, жалю, тугі і інш. Пік свайго развіцця гэтая плынь набывае ў XX ст. на глебе песімістычнага погляду на эпоху Асветніцтва і нямецкую класічную філасофію. Тэхнічны, навуковы і маральны прагрэс апынуўся для чалавека кашмарам сусветных войнаў і таталітарызму. Вайна з фашызмам стала падмуркам для разгляду ўнікальнасці чалавечага існавання і росквіту экзістэнцыялізму: толькі ў парогавым стане сам насам са смерцю чалавек разумее сваю сутнасць, сваю «экзістэнцыю» [5]. Цяжкі і часам трагічны шлях станаўлення і развіцця нацыянальнай культуры, нацыянальнай самасвядомасці і самаідэнтыфікацыі адлюстроўваўся і на фармаванні такіх каштоўнасцей беларускай культуры, як схільнасць да кампрамісаў, негвалтоўная стратэгія ў вырашэнні канфліктаў («памяркоўнасць»), ідэнтыфікацыя сябе з групай, агульнасцю («тутэйшыя») у процілегласць заходняму індывідуалізму, прыярытэт духоўных каштоўнасцей над матэрыяльнымі, гармоніі з грамадствам і прыродай («усё будзе добра»), абвостранае адменнае пачуццё нацыянальнага гонару («гэта мы – беларусы»), моцны ўплыў духоўна-рэлігійных усталёвак («Божа дапаможа»), спадзяванне на ідэалы справядлівасці, захаванне грамадскай згоды («згоды») [8]. Гледзячы на сваё мінулае, мы разумеем, што беларускія землі і ў прамым, і ў пераносным сэнсе заўсёды знаходзіліся на скрыжаванні міжнародных дарог, уплываў, зацікаўленасцей, культур. Гэта памежжа выконвала двайную функцыю: з аднаго боку, беларуская культура ўспрыняла лепшыя дасягненні ўсходняй і заходняй культур, стварыўшы арыгінальную і самабытную культуру. З іншага боку, менавіта памежжа і сталае знаходжанне ў сферы розных культурна-цывілізацыйных уплываў не далі беларускай культуры магчымасці да канца самавызначыцца, выбраць свой «шлях». Беларусы не могуць, у адрозненне ад сваіх суседзяў, ідэнтыфікавацца толькі з адной культурнай традыцыяй. Затое яны могуць лічыць сябе нашчадкамі ўсіх гэтых традыцый нароўні з іншымі нацыямі.

«Парогавыя станы» можна разлядаць як пэўны артэфакт беларускай культурнай традыцыі. Як кажа у сваім артыкуле вядомы беларускі культуролаг А. І. Смолік, працяглы час прадстаўнікі гуманітарных навук не ўдзялялі належнай увагі даследаванню прыроды, сутнасці і структуры артэфактаў. Час ад часу да іх вывучэння звярталіся археолагі, музеезнаўцы і этнолагі як да зыходных даных выключна з пазіцый гістарычнай каштоўнасці, перыядызацыі або разнастайнасці прадметаў побыту розных этнасаў. У той жа час даследаванне культурагенезу, механізмаў культурнай эвалюцыі, вызначэнне законаў культуры і яе марфалогіі паказалі, што без дасканалага аналізу артэфактаў рашыць пастаўленыя задачы немагчыма. Таму мы можам вывучаць «парогавыя станы асобы» праз «аўтарскі твор», дзе сімволіка-сэнсавая зменлівасць дазваляе прасачыць змены ў культурнай разнастайнасці чалавечага досведу. Фарміраванне культуралогіі на постсавецкай прасторы актуалізавала праблему артэфактаў як аднаго з прадметаў яе вывучэння [7].

У кантэксце глабалізацыі сусветнай гісторыі вывучэнне «парогавых станаў асобы» можа стаць кропкай захавання нацыянальных прыярытэтаў, кропкай яднання розных нацыянальнасцей, канфесій, культур. У сучасных, няпростых для свету ўмо-

вах, трэба прыслухоўвацца да гістарычнага мінулага, духоўных традыцый, шанаваць усё тое канструктыўнае ў іх, што спрыяе кансалідацыі народаў. Духоўныя традыцыі, акумулюючы досвед мінулага, з'яўляюцца культура-генетычным кодам народа, захоўваюць яго «рысы вечнасці», існуюць насуперак пераменліваму часу і ўсяму гістарычнаму як часовай з'яве. Любоў да роднай зямлі, прыхільнасць да родных месцаў, гаспадарлівасць, ашчаднасць, працавітасць, адданасць сям'і і сямейнарадавая салідарнасць – характэрныя рысы беларусаў, якія закладваюць асновы палітычнай культуры [4]. Арыентацыя на такія каштоўнасці з'яўляецца асабліва важнай для сучаснай моладзі, будучыні краіны, найбольш актыўнай і здольнай часткі грамадства. Фарміраванне жыццесцвярджальнага маладога пакалення з'яўляецца адным з галоўных фактараў забеспячэння ўстойлівага развіцця дзяржавы і грамадства. Новае пакаленне нясе адказнасць нароўні са старэйшым пакаленнем за захаванне і будучыню краіны, за пераемнасць гістарычнай і сацыякультурнай спадчыны.

«Парогавасць» сучаснага беларуса крыху змянілася, бо змяніліся межы: яны пашырыліся за кошт жыцця ва «ўсеагульнай павуціне». У сучасных умовах нормы традыцыйнай этыкі, маральныя запаведзі, якімі чалавецтва карыстаецца на працягу стагоддзяў, не ў поўнай меры забяспечваюць механізмы этычнай рэгуляцыі ў вобласці палітыкі, эканомікі, міжнароднай дзейнасці. Безумоўна, гэта свайго роду сацыяльны заказ на распрацоўку маральна-палітычных і праўных асноў сучаснага грамадства, што ўлічвае глабальныя змены сучаснага свету і адрасаваны, перадусім, моладзі. Важна фармаваць у моладзі актыўную жыццёвую пазіцыю, павышаць прававую і палітычную культуру, гатоўнасць да ўдзелу ў грамадскапалітычным жыцці, ствараць умовы для рэалізацыі прафесійных ведаў.

Каб навучыцца «жыць у сетцы», трэба сабраць разам самыя разнастайныя кампетэнцыі, навучыцца самаўдасканальвацца. Развіццё прасторы Інтэрнэту прыводзіць да станаўлення так званай «сеткавай філасофіі і культуры».

Такім чынам, сучасны свет ужо немагчыма ўявіць па-за інтэграцыйнымі працэсамі, дыялогам асобных культур, «сустрэчы цывілізацый», нягледзячы на тое, што інтэграцыйныя і глабалізацыйныя працэсы ў пэўным сэнсе звужаюць магчымасці нацыянальных супольнасцей, уплываць на сусветную філасофію і культуру. Гэта не значыць, што эпоха нацыянальных адукацый завершана, што ўсе накіраваліся да «свету без меж». Важна шукаць механізмы кіравання інтэграцыйнымі і глабальнымі працэсамі, усталявання як агульнаеўрапейскай, так і сусветнай дэмакратыі пры захаванні суверэннасці нацыянальных дзяржаў і культур у межах кожных з'яднанняў і саюзаў.

Такім чынам, асноўныя філасофскакультуралагічныя плыні збіраліся вакол гістарычнай спадчыны і, зыходзячы з гістарычнага і культурнага кантэксту мінулага часу, пераўтварыліся у парогавыя моманты сучаснай філасофіі і культуры. Пры эксплікацыі асноўных плыняў мы прыйшлі да высновы, што чалавечае «Я» ўсё больш пераўтвараецца ў нелінейную хвалю волі і адказнасці, вандроўніка ў стыхіях магчымага быцця. У адпаведнасці з новымі выклікамі сучаснасці, якімі ёсць рэальныя перадумовы ў выглядзе сацыяльна-эканамічных і тэхналагічных падстаў, можна казаць пра станаўленне транснацыянальнай, дысцыплінарнасінэргетычнай, чалавекаразмернай карціны сацыяльнай рэальнасці. Вызначэнне статусу і духоўных каштоўнасцей лакальных культур, шляхоў ахоўвання культурнацывілізацыйнай ідэнтычнасці ў глабалізацыйным свеце набывае сёння адменную актуальнасць. У фармаванні нацыянальнай культуры вялікую ролю вызначае нацыянальная інтэлігенцыя, эліта грамадства. Яна распрацоўвае канцэпцыю нацыянальнага з'яднання, дае асноўныя каштоўнасныя арыенціры, выступае носьбітам беларускай ідэі, пасрэднікам, дзякуючы якому адбываецца далучэнне народа да нацыянальнай культуры.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Минск, 1993.

2. *Банцэвіч, П. К.* Творчасць Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце культуралогіі / П. К. Банцэвіч. – Гродна: ГДАУ, 2007. – 310 с.

3. *Дубянецкая, І.* Беларуская этнафіласофія. Навука і інавацыі / І. Дубянецкая. – 2021. – № 4. – С. 64–66.

4. *Калачёва, И. И.* Молодая белорусская семья в XXI в.: сохранение преемственности традиций и инновации / И. И. Калачёва // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол.: Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2011. – С. 37–42.

5. *Клишевич, Н. С.* Философско-культурологическое осмысление категории «экзистенциальный выбор» / Н. С. Клишевич // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия Е. Педагогические науки. – 2013. – № 7. – С. 151–155.

6. *Моторошилова, Н. В.* Феноменология. Новая философская энциклопедия: в 4 т. / Н. В. Моторошилова; Институт философии РАН; Национальный общественно-научный фонд. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Мысль, 2010.

7. *Смолік, А. І.* Артэфакт як структурная адзінка культуры / А. І. Смолік // Человек в социокультурном измерении. – 2022. – № 1. – С. 4–9.

8. *Тарасова, Т. Н.* Беларуская проза XX стагоддзя ў еўрапейскім літаратурным кантэксце: экзістэнцыялізацыя духоўнага свету героя: аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук / Т. Н. Тарасова. – БГПУ, 2013. – 44 с.

***Пастуміла / Received:*** *10.01.2023*